

## Надзея ПАРЧУК

### Свежаспечаны хлеб

*Шлю пашану зярняці*
*І табе, дзедаў серп!*
*З чым твой пах параўнаць мне,*
*Свежаспечаны хлеб?*

*Ці то з водарам родным*
*І зямелькі, і рос,*
*Ці то з сілай нязводнай*
*Неспасціжных нябёс?*

*І твой пах, і цябе я*
*Параўнаю з раллёй,*
*З аржаніцаю спелай*
*І з людской дабрынёй.*

*А без гэтага, знаю:*
*Пустата на стале.*
*Вось чаму праслаўляю*
*Свежаспечаны хлеб.*

***

*Адчыню паўднёвае акно —*
*Хай пакой напоўніцца вясною,*
*Па якой сумуецца даўно,*
*Асабліва зімняю парою.*

*Хай запахне свежасцю ў мяне —*
*У прыбранай чысценька святліцы,*
*Расцвіце зноў сонейка ў акне*
*І душа захоча памаліцца.*

*І вясна, і светлыня навек*
*Анікому з нас не надакучыць.*
*Іх вітае добры чалавек,*
*Захапляцца імі дзетак вучыць.*

***

*Я вітаю цябе, мая раніца!*
*Я вітаю цябе, маё неба!*
*Больш бядою твой твар*
*не апаліцца —*
*Нам пажараў сусветных не трэба!*

*Анічога благога не здарыцца*
*З Беларуссю маёю ніколі...*
*Бласлаўляйся, блакітная раніца,*
*Падымай сваё сонца над полем!*

*Нам свяціць яно з высяў*
*не зморыцца:*
*Ёсць цяпла і святла ў ім багата.*
*І ніколі няхай не паўторыцца*
*У гісторыі чорная дата.*

*Я вітаю цябе мірнай, раніца!*
*Я вітаю цябе чыстым, неба!*
*Хай заўсёды так дзень*
*пачынаецца,*
*А іначай... іначай не трэба!*

***

*Узнялося сонейка над зямлёй —*
*З рунню павіталася маладой,*
*Абудзіла промнямі цёмны бор,*
*Паляцеў птушыны спеў*
*на прастор.*

*Слава паднябеснае сіняве!*
*Ах, як вясна-зеляна на траве!*
*Залацяцца дзьмухаўцы, зіхацяць,*
*А над імі конікі стракацяць.*

*Дзякуй табе, сонейка, і паклон!*
*Вось такіх бы светлых*
*нам болей дзён!*
*Вось такой бы радасці-светлыні*
*Нам у кожным сэрцайку,*
*кожным дні!*